Самая моцная зброя

Аўтар: Анна Віткоўская
20.04.2013 01:00



“Ну і што з імі рабіць?” – разважала цётка Ліда, размешваючы цукар у кубку з кавай і паглядаючы на сваіх пляменнікаў.

Паўлік і Максім не маглі спакойна сядзець на месцы, увесь час сварыліся і пакрыквалі адзін на аднаго. Пакуль цётка Ліда намазвала джэмам кавалак булачкі для іх сястрычкі Ані, за сталом адбылася сапраўдная вайна.

– Ну, хопіць, так справа не пойдзе, – строга сказала цётка. – Максім, ты ж старэйшы, як табе не сорамна? Навошта ты стукнуў Паўліка? Я ўсё бачыла.

– А ён першы пачаў. Сядзіць і абзываецца.

– Не, ён першы, – захныкаў Паўлік.

– А я чула, як Паўлік Максіма абзываў дрэннымі словамі, – паведаміла Аня.

– Паўлік, гэта праўда? – спытала цётка Ліда. † Той нахмурыўся і моўчкі апусціў галаву. Максім кінуў пераможны погляд на брата.

– З’ешце яшчэ па лустачцы хлеба з джэмам, а я вам штосьці раскажу, – прапанавала цётка Ліда.

Вочы дзяцей нецярпліва загарэліся – яны любілі слухаць цётчыныя гісторыі.

– Але спачатку я спытаю, якую вы ведаеце зброю?

– Пісталет! – выпаліла Аня.

– Кулямёт і граната! – услед за ёй крыкнуў Максім.

– А я ведаю меч, – заявіў Паўлік.

– Але гэта яшчэ не ўсё... – загадкава сказала цётка Ліда.

– Танк! Бомба! Ракета! – пасыпаліся адказы дзяцей.

– Правільна, але ёсць такая зброя, якая заўсёды б’е прама ў сэрца, ніколі не прамахваецца і робіць вельмі балюча. Ведаеце, пра што я?

Дзеці прыціхлі, разважаючы. Што ж гэта можа быць?

– Я вам падкажу, – усміхнулася цётка. – Паўлік, уяві, што Анечку хтосьці абазваў дрэнным словам. Што б ты адчуў?

– Ух, я б яму даў!

– А чаму?

– Мне было б крыўдна і балюча за сястрычку.

– Вось ты і адчуў бы на сабе сілу гэтай зброі.

– А, я зразумеў! – закрычаў Максім. – Гэта зброя – дрэнныя словы, так?

– Сапраўды. А вы заўважылі, што яны заўсёды трапляюць у цэль?

– У сэрца?

– Прама ў сэрца. І рану ад іх вылечыць вельмі складана. Бывае, што ніколі яна цалкам і не загойваецца.

Цётка Ліда замоўкла і паглядзела на дзяцей.

– А сказаць я вам хацела пра тое, што мы з вамі, дзеці, таксама салдаты. І ўдзельнічаем у самай вялікай вайне.

– Як у вайне? А хто з кім ваюе? – тут жа пасыпаліся пытанні.

– Ваююць два вялікіх войскі. Адно войска шматлікіх зласлівых анёлаў, а другое войска Езуса і Яго анёлаў!

– А вы ведаеце якой зброяй можа карыстацца д'ябал? – спытала цётка Ліда.

– Напэўна, яму падышла б уся зброя, якую мы называлі, – сказаў Паўлік.

– Так, бо гэта ён прымушае людзей выкарыстоўваць пісталеты, кулямёты і гранаты, – пацвердзіў Максім.

– Але вы забыліся пра яго галоўную зброю!

– Дрэнныя словы! – сказала Аня.

– Так, яго войска выкарыстоўвае ўсе дрэнныя словы і дрэнныя ўчынкі. А якую зброю выкарыстоўвае Езус?

– Ну, напэўна, добрыя словы і добрыя, сумленныя ўчынкі.

– Усё, што дорыць любоў, – сказала цётка Ліда, – ласкавасць, дабрыня, разуменне, дапамога, прабачэнне і многае іншае. Кожны дзень мы ўдзельнічаем у бітве за нашыя сэрцы, і два камандзіра ваююць, каб перамагчы.

– А як нам вызначыць, на чыім баку мы ваюем? – спытала цётка Ліда.

– Па зброі! – дружна сказалі дзеці.

– Правільна! І тут нельга памыліцца. Калі мы гаворым дрэнныя словы, злуемся, сварымся і дрэнна сябе паводзім, то намі камандуе злая сіла. І яна раніць не толькі таго, каго мы крыўдзім. У нашым сэрцы гэты грэх надоўга пакідае дрэнны след. Але гэта яшчэ не ўсё. Гэтая зброя раніць сэрца нашага добрага Збавіцеля.

– Так? – здзівіліся дзеці. – А чаму?

– У Біблii ж напісана: "Тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі". Значыць, калі мы крыўдзім чалавека, мы крыўдзім і яго Творцу. А яшчэ, за кожны наш грэх Езус пакутаваў на крыжы і Яму было вельмі балюча. Калі мы грашым, мы, як быццам, ізноў Яго ўкрыжоўваем.

– Мы не ведалі гэтага, – сказаў Максім. – А ад гэтага зла можна як-небудзь пазбавіцца?

– Можна, – ізноў усміхнулася цётка, – але яго не пераможаш ніякай зямной зброяй. Калі мы запрашаем Езуса валадарыць у нашым сэрцы, то Ён прабачае нас і змяняе злосць на дабрыню, нянавісць на каханне, і мы становімся падобнымі да нашага Камандзіра, з якім лёгка перамагаць зло. І я жадаю вам, дзеці, заўсёды заставацца на баку Езуса.